Асобны № каштуя усюды 50 кап.

Працоуны народ усіх краеу—злуйчася!

ДЗЯННІЦА

Вестка Беларускаго Нацыянальнага Камісарыяту і Маскоускай Беларускай Сэкцыі Р. К. П. (бальшавікоу).

Рукапісы, якія прысылаюцца у радакцыю ля друку, павінны быць напісаны разборна і на адным боку паперы.

Ня прынятыя рукапісы ля друку звяртаюцца аутарам назад, калі ля пярасылкі іх прыслана марка, як не-та зніштажаюцца. Радакцыя пакідая сабе правы папрауляць рукапісы.

Радакцыя адчыняна ад 11 да 4 г. У гэты часы прымая і радактар.

КОШТ ГАЗЭТЫ.	У РАСЕІ.	ЗА ГРАНІЦУ.
1 м.	1 р. 80 к.	3 р. — к.
2 м.	3 р. — к.	4 р. — к.
3 м.	4 р. 25 к.	6 р. — к.
4 м.	6 р. — к.	8 р. 70 к.
6 м.	8 р. 50 к.	12 р. — к.
9 м.	13 р. 50 к.	18 р. — к.
12 м.	17 р. — к.	20 р. — к.

Перамена адрысу 50 к.

Выпісваючым некульні экз.—робіцца скідка 20%.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Пречистенский бульв., д. 29, кв. 24. Тел. 1-16-02.

№ 3 (47).

Масква, 1919 г. 30 Января. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. II год выданьня.

Приветственные телеграммы Правительству Белорусской Советской Республики.

От первого С'езда Совнархозов Могилевской губ.

МОГИЛЕВ (губ.), 12/I. Первый С'езд Совнархозов Могилевской губернии, входящей в состав Белорусской Советской Республики, освободившейся от ига чужеземных войск, шлет привет Рабоче-Крестьянскому Правительству Независимой Белоруссии, твердо верит, что в ряду других составных частей Российской Федеративной Республики, рука об руку с пролетариатом всего мира мы скоро водрузим знамя всемирного царства социализма.

ПРЕЗИДИУМ С'ЕЗДА.

От 3-го Губернского Могилевского С'езда Профсоюзов.

МОГИЛЕВ, 12/I. Правительству Белоруссии. Третий Могилевский Губернский С'езд Профсоюзов из возвращенного революционному пролетариату его волей Могилева шлет горячий привет восставшим рабочим Берлина, красному вождю спартаковцев Либкнехту, Совету Народных Комиссаров, Рабоче-Крестьянскому Правительству Белоруссии, всероссийскому С'езду профессиональных союзов.

Да здравствует Социализм!

От Тамбовской Секции Коммунистов-Белоруссов.

ТАМБОВ, 10/I. Совнаркому Белоруссии. Тамбовская Секция Коммунистов-Белоруссов приветствует освобождение белорусского пролетариата и восторжествование Советской пролетарской Белоруссии в тесном союзе с пролетарскими федерациями. Будем вести везде освобождение пролетариата и восторжествование коммунизма.

Тамбовская секция: Председатель **Пузырев.**
Секретарь **Гамсонко.**

От Бельской Коммуны.

БЕЛЫЙ, Смол. губ., 10/I. Правительству Белорусской Республики. Исполком Бельской Коммуны от 245 000 населения, приветствуя Белорусскую Советскую Социалистическую Республику, уверен, что кровью спаянная с соседними трудовыми республиками общим направлением Советской России, она уничтожит искусственные границы между нами и европейским революционным пролетариатом для окончательного торжества всемирной революции.

Председатель Исполкома **Эйдельсон.**

От Коммунистов и беженцев-белоруссов в Саратове.

САРАТОВ, 10/I. Белорусскому Совнаркому. Горячо приветствуем Совнарком Белорусской Республики, выражаем радость, обещаем поддержку и защиту Советов Белоруссии.

Коммунисты и беженцы из Белоруссии в Саратове.

От Белорусского Полоцкого полка.

МОСКВА, 4/I. Председателю Белорусского Советского Правительства Жилуновичу. Общее собрание Белорусского Полоцкого полка приветствует в вашем лице образовавшееся правительство освобожденной от ига капитала Белорусской Советской Республики, желает плодотворной работы на пользу всего трудового народа Белоруссии и работы по созданию Белорусской Красной Армии, первые кадры которой уже поступают в ваше ведение в лице Белорусского полка и всей Западной дивизии. Красная Армия освободила Белоруссию, а дальнейшие задачи Белорусской Советской Республики создание мощной Красной Армии, которая даст отпор внешнему врагу пролетариата, надвигающемуся с запада.

Да здравствует Белорусская Советская Республика!

Да здравствует Красная Армия, освободившая Белоруссию!

По поручению общего собрания **Близнюк.**

От А. Бурбиса.

МОСКВА, 5/I. Председателю Белорусското Советского Правительства Жилуновичу. В торжественный момент строительства Белорусской Рабоче-Крестьянской Республики желаю в Вашем лице рабочим и крестьянам Белоруссии защитить, как стальной щетиной мировую социальную революцию от международного империализма. Передайте трудящимся белоруссам о моей готовности, как при самодержавии бороться теперь за Советскую мировую федерацию трудящихся и социализм.

Алексей Бурбис.

Масква, 30 января.

Сацыяльная равалюцыя у сваіх дамаганьнях да пашырэньня па усяму сьвету разам з распаусюжваньням і умацаваньням сярод працоунікау сваіх думак і мэтау, разам са сваімі слаунымі заваіовамі, прыносіць шмат ахвярау дзеля ратунку пралятарыяту і даставаньня яму вольнасці і валадарства, трациць многа сваіх лепшых павадыроу. У Расеі працоунаму народу удалося адоляць буржуазію і права-сацыялістычныя партыі і устанавіць сваю валадарства, як задатак і забязпячэньня дзеля умацаваньня у жыцьці сацыялізму. Усе ворагі сацыялізму прымушаны маучаць ці шукаць сабе прытулку на далюкіх ускраінах пад аховаю хаурусных імпэрыялістау, паграджаючы аттуль кволаю рукою Работніча-Селянскаму ураду і равалюцыйнаму пралятарыяту. Але гэтыя пагрозы ня маюць сілы спалохаць моцную душу пралятарыяту і прытрымоуваюцца на рубяжох Радавае Распублікі гэраічнаю чырвонаю арміяю. Праз гэта ворагі сацыяльнае равалюцыі у Расеі спробавалі іншы ход: яны патаемна, з-за вугла павялі барацьбу і вайну супроць асаблівых дзеячоу сацыяльнаго звароту. Былі зладзейскі забіты Урыцкі, Валадарскі; параняны Ленін. Але такімі полахамі, стрэламі з-за вугла нельга абурыць умацованую у глыбі пралятарыяту і бяднейшаго селянства думку аб валадарсьцвя працоунікоу. Радавая уласць у Расеі ня згібня разам са сьмерцю некулькіх, хоць і вялікіх людзей. Вялікая пагроза сацыяльнуй равалюцыі знайходзіцца ня у Расеі, а за яе рубяжамі, у заходніх землях.

Равалюцыя, ушчаушыся на усходзя, нясьпешнымі крокамі ідзе на заход. Патрэбавалася паутара году с пачатку равалюцыі у Расеі, пакуль яна ня захапіла Гэрманіі і Аустрыі. У «хаурусных» жа гасударствах яна з'ауляяцца і цяпер нытаньням будучых часау. Хаурусныя урады, атрымаушы верх над усцішнаю дзеля іх Гэрманіяй, сьвяткуюць цяпер сваю удзячнасць, дзеляць здабытак, рахуюць, як найбольш абяздоліць пакараны народ. Лічучы сваім мацнейшым ворагам пасля гэрманскаго імпэрыялізму сацыяльную равалюцыю, яны усяляк прагуцца ня пусьціць яе пашырэньня у сябе. Дзеля гэтаго ім трэба задушыць нават пачатак сацыяльнае равалюцыі у сумежнуй і блізкуй Гэрманіі. І вось, сціснуушы гэрманскі народ вахкімі варункамі замірэньня, яны пры кожнум здарэньні напаміпаюць, што ня будуць лічыцца з нямецкімі радамі дэпутатау, што ня зробяць замірэньня да тых часау, покуль ня будзя задушаны у Гэрмані большавізм. Такі полах дае асаблівую моц у рукі сучаснаго ураду Гэрманіі у чале с нацыянал-сацыялістам Шэйдэманам і Эбертам. Як у прашэдшыя часы, у часы імпэрыялістычнае вайны, Шэйдэман злучыуся з патрыотамі-юнкярамі, патрабавау працягу вайны дзеля нацыянальнаго ратунку Гэрманіі пад уладаю Гогенцоллерна, так цяпер іон стараяцца збярягчы нацыянальную еднасць буржуазна-юнкярскае Гэрманіі ізноу такі ад «падзелу» хаурусьнікамі.

Ня дзіва дзеля гэтаго, што Шэйдэман мая падтрыманьня усяе гэрманскае буржуазіі і сацыялістау згодчыкау, ня дзіва, што гэрманская равалюцыя, атрымаушы толькі хвормy радавае, засталася у сваім сэнся толькі буржуазнаю. Рады дэпутатау у Гэрманіі зложаны па большасьці толькі з правых элемэнтау, якім зусім ня па густу сацыяльны устрой. Супроць такога напрамку равалюцыі, якая толькі прыкрылася хвормаю радау, ня атрымаушы духу і сэнсу іх з звязаным з імі гасударсцьвяным і клясавым пераустроям, павялі барацьбу чыстыя і чэстныя сацыялісты партыі «Спартак», у галаве якое з дауных часау стаялі Карл Лібкнэхт і Роза Люксэмбург. Спартакауцы, стаючы на грунця сацыяльнае равалюцыі, трэбуюць передачы усяе уласьці у рукі працоунікау і выпауненьня сацыяльных пераменау і пераустрою. Між спартакауцамі і правіцяльством узгарэлася палітычная барацьба, якая на крысе перайшла у настаяшчыя бойкі між прыхільнікамі абудвух бакоу. На працягу цэлаго тыдню з 8 па 15 января у Бэрліня ішла жорсткая крывавая барацьба. Шэйдэман і Эбэрт апавясьцілі, што яны ня прыпыняцца ні перад чым, каб задушыць гэты «мяцяж». І абаронцам уряду, праліушы шмат крыві равалюцыйнаго пралятарыяту, удалося часова прыдушыць і заглушыць паустаньня. Але гэтаго ім здавалася мала: пакуль заставаліся на волі павадыры спартакауцау — К. Лібкнэхт і Р. Люксэмбург, буржуазія ня магла быць супакойнаю. Іх абоіх заарыштавал, пры гэтум глуміліся над імі, білі іх і чуць ня разарвалі на мейсцы. Потым па дарозя у вастрог, як толькі яны спробавалі уцячы, былі застрэляны азвярэушымі паганцамі. Так проста, па-зверскі расправіліся ворагі пралятарыяту з ім самым у дні 9 і 10 января, так зладзейскі прыкончылі яны тых, хто доугія годы, нават пры Кайзару, віоу працоунікау за сабою к вольнасьці, к сьвету, к сацыялізму.

Няма ужо ні Карла Лібкнэхта ні Розы Люксэмбург. Шэйдэманаускі друк цешыцца тым, што пачауся супакой. Але гэты супакой нядоугі: за ім ушчнецца бура, ды яшчэ якая. Гэрманскі пралятарыят застанецца верным тым думкам, якія пасеялі у ім Лібкнэхт і Люксэмбург. Думка аб міжнароднум аб'еднаньні працоунікоу, аб сацыяльнум пераустрою грамадзянства, думка, за якую гнілі яны у вастрозя і за якую патрацілі сваю жыцьцю, ня загіня з іх сьмерцю. Гэтая сьмерць паскорыць толькі астатнюю рахунковую барацьбу між старым буржуазна-імпэрыялістычным устроям і сацыялізмам. І йменьня Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург ня прападуць у памяці працоунікау усіх зямель і будуць злучаць іх пасьля сьмерці, так, як злучалі пры жыцьці.

Памяць аб іх кліча нас да злукі і барацьбы за ідэалы сацыялізму па усяму сьвету!

Пярад агульнаю нябязпекаю.

Посьля цэлыпаго року браатабойнае войны, ушчатай проціу нас правымі эсэрамі на усходзя, яны пачынаюць прыходзіць парэшця да праудзіваго разуменпя рэчау. У сьляпой пянавісьці да бальшавікоу, яны увайшлі у хаурус з лунымі контр-равалюцыянерамі, свой Устаноучы Сойм яны спадзяваліся змайстраваць пры подмозя трох кітоу контр-равалюцыі: расейскае буржуазеі, царскіх гэпэралау і дыпліоматау хаурусного імпэрыалізму. Гэта была патуга, заранe асуджаная па няудачу.

Мы бязупынанна цьвярдзілі ад самаго пачатку гэтае авантуры, што хаурус белагвардзейцау с правымі эс-эрамі служыць толькі справя контр-равалюцыі, што царскія гэпэралы толькі прыкідаюцца прыхільнікамі Устаноучаго Сойму, тагды як па-праудзя Устаноучы Сойм ня меньш пянавістны ім, чым дыктатура пралятарыяту і што ядынай задавальняючай іх формулаю уласьці іосьць «самадзяржауны царя-батюшка» Мы гаварылі, што яны толькі датуль будуць выступаць у згодзя з правымі ес-эрамі, пакуль лозунг Устаноучаго Сойму будзя мець які-колячы крэдыт у масах і будзя дастауляць контр-равалюцыйным гэпералам жывы чалавечы матэр'ял дзеля барацьбы з Радаваю уласьцю. Мы гаварылі, што як толькі лозунг Устаноучаго Сойму пярастане даваць новых салдат белагвардзейскім гэпэралам, дык яны выкінуць на сьметнік і гэты пяпатрэбны ім лозунг і яго пасіцяляу, правых эс-эрау. Але праваднікі Камітэту Устаноучаго Сойму і слухаць нас ня хацелі: яны як бы і вушэй ня мелі. На усходзя вырас формянны ваенны фронт з гарматамі і куляміотамі, бранявымі паяздамі, аутамабілямі і нават аэрапляпамі. Работніцка-сялянская Расея, ня пасьпеушая саарганізавацца і акрэпнуць посьля ліквідацыі імпэрыялістычпай вайны і Бярэсьцейскаго пасільства, была сьціснута, здушана дапасьледку. Правыя эсэры, у кампаніі з буржуазеяй, і царскімі гэпэраламі, падскаквалі ад радасьці.

Але цяжкасьць палаження прабудзіла энэргію работніцкаго клясу. Чырвоная армія стала расьці с кажным дніом і белагвардзейская хэура хутка пачула на сабе яе цяжкую руку. Бела-эсэраускі фронт стау адкатывацца усіо даляй і даляй на усход. Бачучы, што эс-эры больш ня могуць ім памагчы, царскія гэпэралы пярасталі цацкацца з імі, скінулі свае маскі і сталі іграць у адкрытую. Эс эры ужо ня магли прынясьці карысьці контр-равалюцыі, але толькі пашкодзіць іой сваімі лозунгамі. І мы бачым, што сябры эс-эраускае партыі у Сыбіры, у „пансцьвя адмірала Колчака“ арыштоуваюцца, садзяцца у турмы і нават расстрэліваюцца нараупе з бальшавікамі. Гэтая рантоуная зьмена у адносінах да іх учарайшых сяброу адцьвярозіла эс эрау, як пьяніцу вядро халоднай вады. Яны пачалі прыходзіць да праудзіваго разумення рэчау і ужахнуліся справя рук сваіх. Ядыная, што заставалася

ім,—гэта шукаць прымірэння з Радаваю Расеяю.

Камітэт Установчаго Сойму хацеу пачаць згаворы з нашымі Самарскімі таварышамі,—камуністамі, але тыя пагарадліва адмовіліся. Гэта было трошкі пасьпешна і няабдуманна. Самарскія таварышы узялі пад увагу толькі ваенную моц эс-эраускае партыі, і прауда, што гэтая моц цяпер надта мізэрная. Але яны ня зразумелі, які вялікі псыхолёгічны козыр у рукі Радавае уласьці дала-б капітуляцыя правых эс-эрау і наколькі мацнейшы быу бы галас зарубежных працаунікоу проціу умяшацяльства у расейскія справы. Атрымаушы згоду Цэнтровае Радавае уласці, Уфімскі Ваенна-Равалюцыйны Камітэт пачау новыя згаворы с правымі эс-эрамі. Як яны ідуць, — пакуль што нявядома. Іосьць весткі, што дзеля астатэчнаго высьвеснення усіх пытанняу, зьвязаных з гэтымі згаворамі, да Масквы маяцца прыехаць сам Чэрноу і з ім яшчэ некалькі вядомых эс-эрау.

Правіннасьць правых эс-эрау вялікая, дужа вялікая. Шмат бяды учынілі яны Расеі, ня толькі як Радавуй, але і Расеі самой па сабе. Гэта так, але ня час займацца пяралічаннем правіннасьцяу, калі усясьветная контр-равалюцыя гуртуя свае сілы, каб накінуцца на равалюцыйную Расею, калі ідзе апошняя змаганне за волю і шчасьця пралятарыяту. Мы ня можам згадіцца на жадныя зьмены у канстытуцыі Радавае Расеі, як таго дамагаюцца правыя эс-эры, але калі яны сумеснай працай хочуць направіць свае правіннасьці пярад Расеяй і равалюцыяй,— дык проша!

М. Б.

Ня туды нашая дарога!

За увесь час свайго істнення Беларуская Рада ні разу ня магла пахваліцца праудзівым зразуменням міжнародных і міжклясавых адносінау. Адарваная ад жыцця і ня маючы цеснай злучнасьці з працоунымі масамі, яна у свайой чыннасьці больш кіравалася кніжнымі тэорыямі і сваіою уласнаю фантазіяй, чым пачуццём рэальных патрэбау беларускаго народу. Палітычная блізарукасьць праваДыроу Рады вяла к таму, што Рада ня раз змагалася з самымі шчырымі прыхільнікамі народу беларускаго і наадварот да заклятых ворагау яго зьвярталася с прозьбамі аб надмозя. Апошнія дні лішні раз патцьвярдзілі нам гэта.

На засяданні Рады у Гродні, куды яна вымушана адступіць пад напорам соцыяльнае равалюцыі, разглядалася пытання аб захопных плянах польскіх нацыяналістау у адносінах да адвечна-беларускіх земляу. **Радаю было пастаноуляна зьвярнуцца до Дзяржау Згоды с пратэстам проціу дальскіх аннэксіоністкіх дамаганняу.** Гэта называецца пanасьці пальцам у неба! Усім вядома, што польскі імпэрыялізм знайходзіцца на палажэнні служкі у імпэрыялізму ангельска-французкаго і што урад «соцыялісты» Пілсудскаго у сваіх учынках кіруяцца прыказамі з Лёндану і Парыжу. Усім такжа вядома, што заходня эурапейская буржуазея, волю якой выяуляюць парыжскія і лёнданскія правіцялі, прагнэцца да знішчажэння Расейскае Радавае Распублікі. Ня маючы можнасьці паслаць у Расею сваіх армі[я]у, яна падтрымоувая буржуазею усіх народау бышае Расейскае Імпэрыі і падбухторвая яе да барацьбы з радавым устроям. Асабліваю ласкаю і спагадаю у заходняе контр-рэвалюцыі карыстаяцца польская буржуазея, як пайбольш моцная і пайболяй арганізованая. Каб падаць іой ахвоты да збройнаго выступлення проціу Радавае Расеі, Антанта абяцая падтрымання яе вялікадзяржаўным дамаганням і дае сваю згоду на пашырэння польскіх граніц коштам Беларусі. Як будзя пачуваць сябе беларускі сялянін і беларускі работнік, гэта зусім ня бярэцца у рахунак; самая важная—гэта зламаць бальшавізм, якою-бы цаною гэта ні дасталася. Мэты польскае і ангельска-французкае буржуазеі аднакавы, і зьвяртацца да аднаго разбойніка са скаргамі на другога, падручнаго яму, іосьць лунай бязсэнсіцай. Ня туды вядзе наша дарога і ня гэтак павінны мы адказваць на дамагання польскіх захопнікау: ня ляментацыямі і ня скаргамі, а моцным і грозным клічам: «Рукі прэч, вы душыцялі працоунаго народу! Кончылася вашая напаванне і ня вернецца боляй»! Арганізацыі белагвардзейскіх легіонау мы павінны процівапаставіць арганізацыю працоуных масау Беларускае Радавае Распублікі; стварэння беларускае чырвонае арміі іосьць няадкладнай павіннасьцю Беларускаго Ураду. Толькі яна дасьць магчымасьць беларускаму народу спакойна узяцца за пярабудову свайго жыцця на новых падставах. Усе іншыя дарогі ня прывядуць ні да чога, апрача толькі пагарды і дарэмнае траты часу.

Міхась Баравы.

9 (22) января 1905 году.

Дзень 9 (22) января 1905 году заусягды будзя сьвяткавацца расейскім пралятарыятам, як паваротны пункт у яго гісторыі. У крывавых падзеях гэтаго памятнаго дня ахрысьціліся новыя мэты расейскаго работніцкаго клясу, вызначыліся новыя вобразы яго дасягання[у]; у крывавых падзеях гэтаго дня разам з енкамі паміраушых работнікау і работніц памерла, скончылася усіо тоя, што было нядазрэлаго па-дзіцячы наіунаго у расейскум работніцкум руху, і цяраз горы трупау іон адразу пяраступіу з дзецкасьці у сталы і сьвядомы сваіх мэтау тэрмін.

Да гэтаго дня малаусьвядомляны і нясьвечаны расейскі работніцкі кляс знайходзіуся пад уплывам даунейшых паняццяу аб „бацюшцы—цару“, як аб добрум і літасьлівум да сваіх падданых, якога толькі ашуківаюць паны, хаваючы ад яго прауду аб гаротнум жыцці народу. Сярод петраградзкіх работнікау у гэтум чася вялікую вагу меу поп Гапон, талентны прамоуца. Іон падагрэу і падтрымау гэтую народную веру у царскую літасьцівасьці і угаварыу работнікау пайсьці самым да цара і, паміма яго гэнэралау і чыноунікау, выказаць яму усю прауду аб сваім жыцці. Жылося жа тагды вельмі дрэнна. Цяжкая вайна з японцамі, няма ведама за што пачаушаяся, стаміла народ. Немаль усе мелі каго-колячы са сваіх блізкіх на паліох бітвау, у даліокуй Манчжурыі. Даражыня, няхватка харчоу, няпамерна нізкая плата за работу абціжарылі і бяз таго нязавідная жыццё расейскаго працауніка. Да усяго гэтаго далучауся няімаверны зьдзек царскіх чыноунікау, царскае паліцыі і ахранкі, ня толькі катаваушых расейскіх працаунікоу, але і насьміхаушыхся з сьмае іх душы... Шмат накіпела у народнум сэрцы, і было пастаноуляна давясьці да ведамасьці цара аб цяжкум палажэнні народу, у дзіцячуй веры спадзяючыся, што цар, як дазнаяцца аб гэтум, даложыць усіх стараннау, каб паменьшыць цяжар народнаго жыцця. На 9-я января ст. ст. было назначана нешта накшталт усенароднаго паходу да Зімняго Палацу, гдзе знайходзіуся тагды цар. Раніцою марознаго дня з усіх канцоу аграмаднаго места пацягнуліся нялічоныя масы працоунаго люду. Шлі моучкі, бяжадных песьняу, бяз штандартау бяз аружжа; кабеты вялі с сабою сваіх дзяцей; была нешта біблійная у гэтум усенароднум паходзя да свайго цара; а наперадзя глаунае масы народу ішоу сам поп Гапон с крыжам і царскім патрэтам у руках. Цар пярапалохауся; пярапалохаліся і яго прыдворныя. Уся справа бы а выстауляна імі, як мяцеж, паустання проціу цара. Пярапалоханы цар вялеу прызваць казакоу дзеля абароны палацу і калі народ будзя старацца надыйсьці да палацу,—страляць у яго. Наказ цара быу выпауняны дасканала. Кроу бязбронных кабет і дзяцей пачырваніла марозны сьнег; казацкія коні таптали упаушых.. Страляння у бязбронны народ было найвялікшаю няспадзейкаю ля усіх, ніхто ня мог і падумаць, што можа стацца гэткая гідасьць. Але яна сталася, і гук стрэл у рассеяу увесь той туман, якім быу спавіты розум работнікау. Да балючай вачавідкасьці стала ясна, што цар гэткі-ж самы злачыннік, як і яго міністры, і пакуль будзя іон—ня будзя дабра працоунаму народу. Сазнання расейскаго пралятарыяту зрабіла вялікі і апошні крок у кірунку равалюцыйнасьці; ужо вечарам гэтаго дня на піцерскіх вуліцах зьявіліся чырвоныя штандары з лёзунгамі: „Далоу крываніуцу—цара“ і пачалася збройная барацьба с царовымі служкамі і абаронцамі яго пасаду. Водгук стрэлау 9 го января пракаціуся па усіей Расеі і усюды прабуджау пралятарыят да змагання з царызмам. Равалюцыя пайшла шпаркім разгонам наперад, але нядахват арганізованнасьці і цямната масау пярашкодзілі іой дакаціцца да свае астатняе мэты,— зьнішчэння царызму. Расея атрымала толькі „куцую канстытуцыю“ 17-го акцябра. Чорныя груганы рэакцыі, сабраушы усе свае сілы, павялі плянавы паход проціу заваіованых народам вольнасьцяу, і за некулькі гадоу іх працы ад маніфэсту 17-го акцябра застауся толькі успамін.

Але кроу нявінных ахвярау 9-го января ня пралілася дарма. Праз дванаццаць гадоу посьля гэтаго народ яшчэ раз падняуся і назаусягды скінуу з сябе путы царызму.

Хай жа будзя ліогкай зямелька гэтым ахвярам нашае вольнасьці!

Павал Любецкі.

Задачы Беларускаго Радаваго Ураду.

(Працяг стацьці у № 2 (46).

У апошнія пяць гадоу Беларусь ператрывала, разам са усей Расеяй, вялікі штурх і вялікія грамадзянска-палітычныя змены, якія парушылі вяковыя закладзіны жыцьця і пастанавілі няадкладна зрабіць новы грамадзянскі устрой, новыя адносіны. Імпэрыялістычная вайна зрабіла нязлічаныя шкоды Беларусі, прымусіушы цэлыя аграмады народу рынуцца на усход, у Расею шукаць прытулку ад вайны, распаусюжыушы траха ня усе яе культурныя установы, грамадзянскія гуртки, навуковыя справы і сусім скасаваушы аканамічная жыцьцё, як прамысловасць, гандаль і грашавыя абароты. Шмат якія з колішніх установау, абураных і скасованых вайною, у сучасны момэнт ня адказваюць патрэбам жыцьця і аб іх шкадаваць нечаго. Але шмат з іх былі б натта патрэбны і цяпер і настолькі патрэбны, што баз іх нельга мысліць аб узбудовя культурнаго жыцьця нашае краіны. Напрыклад, школы, дайшоушыя да поунаго упадку на усей Беларусі, трэбуюць асабліваe цікаувасці да іх патрэбау, інакшай Беларуская Распубліка застанецца на доугія часы у хвасце усіх суседніх народау у справах прасьветы. Дзеля гэтаго належыць перш усяго вярнуць назад у Беларусь вывязаныя аттуль праз вайну школы, потым памагчы акрыяць тым, якія засталіся на мейсцы. Беларускі Радавы Урад шмат пасобіць падтрыманьню прасьветы, калі зможа хутка і у пору нарыхтоваць збяражоныя школы з іх настауніцтвам.

Ня меньшую значнасць дзеля культуры страны маюць і справы зносін, як чугункі, тэлеграф, тэлефон і інш. Яшчэ с пачатку вайны шмат паштовых, тэлеграфных і чугунковых установау былі вывязаны у Расею з іх маетнасцю і служачымі, дзе яны працуюць і да гэтых часау. У апошнія ж часы праз варварскі наступ немцау і польскіх лягіянерау шмат тэлеграфау, чугунак знарочыста перапсавана, як напрыклад: забраны лепшыя тэлеграфныя апараты, перарваны дрот, узарваны на чугунках рэйкі, масты і нават пасыманы званкі на станцыях. Праз гэта беларускія віоскі і нават паветавыя гарады адрэзаны ад сьвету, ня маюць ніякіх вестак з чужых краіоу і жыцьцё асабіста, зачыняна. Кожнаму ведама, што культурны народ ня можа жыць без зносін з чужым сьветам, што гэтыя зносіны патрэбны дзеля самаго культурнаго развіцьця народу. Вось дзеля чаго Беларускаму Правіцяльству належыць няадкладна парупіцца аб нарыхтаваньні справау зносін. А каб нарыхтаваць іх трэба перш усяго пакліxаць да дому усіх сьвядомых і патрэбных у працы па гэтым справам людзей, якія некалі былі прымушаны пакінуць Беларусь. Разам з людзьмі належыць вярнуць і тыя установы, дзе яны служылі, а так сама і даравацъ грашавую падмогу дзеля належнаго настрою працы па вазстановя пошты, тэлеграфу і чугунак. Значыцца няадкладная рэвакуацыя і праца на мейсцох па вазстановя паштова-чугунковых зносін павінна стаць чароднаю задачаю нашаго ураду.

Няадкладна павінна быць парашона і пытаньня аб бежанцах. Да гэтых часау, хоць і шмат бежанцау жадалі вярнуцца да дому, але агульня гэта ня удавалася. Перашкаджалі таму то нядахватка справау перавозкі, то разныя прыдзіры з боку нямецкаго камандаваньня і консульствау, то няарганізованасць харчавое і грашавое падмогі. Цяпер глаунейшая з перашкодау — прыпынак з боку немцау — скончылася. Але няулады с перавозкаю, найменьня падмогі бежанцам і да гэтых часау прымушаюць бежанцау блукацца па чужых мяісцох. І усамдзеля, трэба шмат адвагі, каб пусціцца у дарогу, ня ведаючы, колькі дзіон прабудзяш у іой, ня маючы столькі грошай, каб прахарчыцца у дарозя пры сучаснуй даражыні. А што чакая іх дома? Будынку няма— жыць недзя. Скаціны так сама няма— нечым абрабляць зямлю, не с чаго завясці гаспадарку. Мала таго, каб перавясці бежанца да дому. Трэба яшчэ даравать яму магчымасць вазстановы свае гаспадаркі, ня даць яму шчарзаць і згібнуць у той момэнт, як іон рвецца усім сэрцам будаваць новае жыцьцё, новае шчасьця. Такім спосабам, забяспячэньня грашавою і гаспадарскаю падмогаю бежанцау з'яуляяцца патрэбаю і пытанням сягодняшняго дню. Месяцы праз два пачынаяцца вясна, пасеу. І каб бежанцы ня былі бязкарыснаю цяжару, трэба за гэтыя два месяцы зрабіць самую рэвакуацыю іх і даравать ім магчымасць узбудаваць сваю гаспадарку.

Пры важкіх варунках аканамічнага быцьця узрадзілася Беларуская Радавая Распубліка. С аднаго боку вялізарныя патрэбы са усіх бакоу, трэбаваньня пад-

ІГРЫШЧА.

У карчмя тупат, грук вялікі,
Пары у скокі папясьлісь ..
Вось музыкі, дык музыкі!
Скуль яны прывалакліся?
Як засыплюць, як заграюць,—
Мо-б і хворы ня утрымау,
А скрыпач-то як уярыць—
Бытцам чорт ім кіравау!
Як шаліоны, смык лятая,
Скрыпка голасна зьвініць...
Ну, дзівота—як жывая—
От, здаецца, гаманіць:
Тупай, тупай, вясяліся,
Прапіу грошы—ня журыся,
Няма грошай—што парадзіць,
Калі нам нідзе нявадзіць?
А другая скрыпка тонка
Як заграя, як утне
Дробна-дроб а, ды так звонка,
Што усе зыкі пераймe:
«Цілі-цілі! Цілі-лі!
Усе вясіолыя былі,
Выцінялі і скакалі,
Дзе прышлося, начавалі:
Хто пад лавой, хто пад плотам
З адным лапцям, з другім ботам».
І басэтля без упынку
Усіо раве і усіо раве,
Пеклам робіць вячарынку,
Ліогкосць скокам дадае:
«І ня даляй, як у дзень
Я маучала, бы той пень,
А цяпер я—дубам-дуб!
Тупу, тупу, тупу, туп!
Я грамчэй ад усіх раву,
Хай усе струны перарву,
Ды ты слухай, Апанас,
Што за голас, што за бас!»
Бубян тахты выбівая,
Барабан у лад брацчыць
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Адатне ды зноу пачне;
Як зальецца, як зальецца,
Ажно, падла, страсяне:
«Засярдую, засярдую,
Бо на што ты брау старую
І крывую, і рудую
І сляпую, і дурную
Віславуху, касавоку
І без смаку, і без кліоку?
Хлопцы ног ня шкадавалі.
— Гэй, трасецясь, к сяле!—
То кружыліcь, то лятали,
Бытцам тыя матыле.
А дзяучаты, як цьвет макау,
Краскай твары іх цьвітуць.
— Варушыся шпарчэй, якау!
Ня драмлі, брат,—затаукуць!—
Кончуць скокі, адпачынуць,
Лбэ музыкі абатруць,
На марозя хлопцы стынуць,
Покі рагі абасхнуць.
Усіо сяло сюды зьбіралась,
Каб пабачыць і пачуць,
Як ігрышча адбывалась,
Як «мяцеліцу» мятуць,
Як музыкі здольна гралі,
Як гудзеу тут барабан.
Каму-ж мейсца ня хапала,
Той лез просто на паркан.
А музыкі як заграюць,
Як ускверадь, як утнуць,—
І старэчых падбіваюць
Разыйсьціся, рызынуць.
— Што, Хама брат, дай пакажам,
Як скакалі колісь мы?
І музыкау заувпажым —
Кажа Сіомка да Хамы.
— Ну, куды вам? Сакадухі!—
Учуу іх гутарку Адам:
Тупняш—сыпня напаруха—
Сорам будзя толькі вам!—
— А што будзе? Папробуем!—
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Усе старыя грамадою
Загукалі на увесь дом.
На мінуту усіо замерло
Ад басэтлі да дуды:
Што скакаць ім так прыперла,
Ім у старэчыя гады?
— Грайця, хлопцы!—крыкнуу Сіомка.
— «Каваля»!—гукнуу Хама,
Узяуся у бокі стукнуу іомка—
І пашла тут куцярма.
Вот старыя разышліся,
Стау адзін перад другім,
Узварухнулісь, затрасьліся,
Захадзілі целам усім.
То закруцяцца старыя,
То рукамі павядуць,
Ускінуць кудлачкі сівыя,
Галавамі сьцеляпнуць,
То нізютка прысядаюць,
То у бок выкінуць нагу,
Утахту ладкі адбіваюць,
У гору шапкі падкідаюць,
Раптам згорбяцца у дугу,
То пачнуць часаць нагамі,
Дробным крокам гарцаваць,
То ускінуць плячукамі,
То ізноу пачнуць часаць!
Навакола усіо дрыжала—
І у карчме і за вакном,
Усе шумела і крычала,
Больш ахвоты поддавала
Двум старэчым скакуном.
„Свіння у рэпя, свіння у рэпя,
Парасяты у грэццы,
А музыка без языка
Каля печы трэцца“.
Скача Сіомка, падпявая,
Змоук—пачау тагды Хама:
Кума кума спавядая,
Што прападалася дарма:
«Ой ты кумя, мой кумок,
Бадай табе трасца у бок!
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Дзе чартэ цябе ганялі? —
— Ой, кума! На што той глум?—
Джургануу чупрыну кум:
Такіх краль нідзе няма,
Як ты, мілая кума!
Да цябе я бег, сьпяшауся,
Аж мой лапаць развязауся.
Ні завязау бы я абору,
Але Бог прыслау Тадору.
Ось мы з ею і вязалі,
З ею трошкі жартавалі,
Ой, Тадора! Ой, кума!
Я ад вас сайду з вума.
Як вы мілы і прыгожы!
Але я на што пахожы?
Бо за вамі ня сплю ночы,
Бо да баб такі ахвочы!» —
Усіо у карчмя калацілась,
Пляск у ладкі скакуном,
Мора зыкау пакацілась
І злілося у цэлы гром.
— Сорам усім вам, маладыя!
От уцерлі вам насэ!
Ну, старыя! Ну, старыя!
Так заткнуць за паясэ!..
І вот у самы віхар скокау
Шусь у карчму з кіям поп—
На той час, як Хведар-дока
Выбівау з Аудоляй дроб.
Поп прыйшоу сюды, каб словам
Чортау сьверб ахаладзіць
І удзяубці тут усім галовам,
Як на сьвеця трэба жыць,
А за ім сінкліт царкоуны:
Дзяк і староста, званар...
Строгі бацька быу духоуны,
Ня любіу чартоускіх чар.
Іон ня раз ужо з амбона
Усе ігрышча касавау,
А аматара Лявона
Служкай чорта називау.
І яму ужо на тым сьвеця
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

Дык нясеця-ж сала у крупнік,
Мяска, рыбу мне на квас.
Я спауняю Божу волю,
С чортам рэжуся на нож.
А вы што? У карчму к Сролю
Нясяце апошні грош.
Дзе-ж ваш доуг і дзе сумення?
Ня пакаяцясь—ваш ліос:
Замест райскаго збавення
Хвіга будзя вам у нос“.
Ды Лявон быу шыт ня лыкам,
Ня палохауся папа,
Падыйшоу, маргнуу музыкам:
— „А ну, хлопцы—гапака!“
Барабан забіу трывогу,
Бубян дробна забратчау,
Ім басэтля на падмогу,
Смык шаліона залятау,
І як грымнулі, згралі,—
Шкура шорхнула ва усіх,
І старыя ня утрымалі,
Падхапіу віхор і іх:
Сівы Янка на заслоня
Стау плячыма выраблять,
А Карусь забіу у далоні,
Сіомка зноу пашоу скакаць.
Поп, вайшоушы з-за парога,
Грозна рот быу адчыніу,
Каб прамовіць слова строга,
Але губу прыкусіу.
А музыкі ня знаукаюць,
І адкуль яны бяруць?
Як ускверадь, як заграюць,
Аж чартэ цябе бяруць.
Твар у бацюшкі дабрая,
Шапка споуза са лба,
І рука сама дурэя
Паузьверх праваго клуба.
У куток іон кій стауляя,
Барадою сьцяпануу
І рызман свой распрауляя
Потым голаву [illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]
[illegible]

[illegible]

могі, кірауніцтва. З другого боку убогасць, беднасць і разор у гаспадарска-аканамічных справах, якія даюь сябе чуць асабліва на Беларусі. І бязсумненна, што маладая Беларуская Распубліка ня зможа падтрымаць сваю жыцьцё, калі іой ня будзя падмогі з боку. Ужо справіцца з выказанымі намі задачамі наурад ці справіцца наша Распубліка бяз падтрыманьня. За падмогаю Беларусь павінна звярнуцца да свае старэйшае сястры — Расейскае Радавае Распублікі. Расейская Работніча-Селянская Правіцяльства са свайго боку дзеля салідарпасці і еднасці працаунікау абедзьвіх староння пакіня бяз увагі патрэбы Беларусі і ня адапхне яе ад сябе своею нядбаласцю аб долі пагарджанаго ліосам беларуса.

Будзям спадзявацца, што наш Радавы Урад парупіцца нарыхтаваць належныя дыпліоматычныя зносіны з Расейскім Правіцельствам дзеля распрацаваньня і направы розных акапамічных справау між абедзьвіма Распублікамі.

Я. Петровіч.

Аб беларускуй чырвонуй арміі.

Вялікая Сацыяльная Равалюцыя у Расеі даліока яшчэ ня скончылася. У цяжкіх пакутах последау вайны пралятарскаму ураду прыходзіцца закладаць новы сацыяльны устрой, які мая шмат ворагау як дома, сярод свае буржуазіі, так і за рубяжом, у грашаунікоу і імпэрыялістау. З гэтымі моцнымі ворагамі ня здавольня адпае палітычнае барацьбы праз слова, друк, выбары, навучэньня і іншыя спосабы так званае мірпае спрэчкі. Вораг стаць на рубяжох і гатуяцца задушыць равалюцыю і яе абаронцау варужжам. Вядома, што сіла варужжа можа быць адбіта толькі ж варужжам. Вось дзеля чаго, расейская сацыяльпая равалюцыя, ня згаджаючыся у сваіх поглядах і мэтах с патрэбаю ва усягдашнюй арміі, ня прызпаючы абавязковай ваеннай службы, прымушана была, зніштожыушы старую армію, стварыць новую, чырвоную, якой даручыла сваю абарону, сваю будучыну. І да апошніх часау чырвоная армія вядзе гэраічную барацьбу; ворагі равалюцыі ня сьмеюць і ня маюць сілы падбліжыцца к цэнтру яе. Дзякуючы чырвонуй арміі ва усей цэнтровуй Расеі супакойна і бяз перашкодау пашыраяцца і умацоуваяцца сацыяльны устрой.

Зусім іншая палажэньня на ускраінах. Праз дальнасць іх ад цэнтру, псэту зносін з ім, слабасць палітычнаго жыцьця, нацыянальную рожніцу, тут знайшлі сабе прытулак і умацаваліся розныя контрравалюцыйныя сілы ад правых сацыялістау да самых заядлых чорнасотнікау. Знайшоушы сабе тут цьвіорды грунт, яны да апошніх часау пагражаюць наступам на равалюцыйную Расею, хоць зямля і хістаяцца цяпер пад іх нагамі, бо равалюцыйны рух сярод працоунікау там ня прыпыняяцца і цяпер стау натта чутным. У сваім пражэньні адоляць равалюцыю яны маюць, апроч усяго, падтрыманьня з боку англа-францускаго ураду, якому так сама няпрыемна і шкодліва сацыяльная Равалюцыя.

Беларусь, па свайму геаграфічнаму паляжэньню, займая цяпер крайні заходні рубеж, абмяжоуваючы вобласці, дзе замацавалася сацыяльная равалюцыя. Гэты рубеж ня усюды аднакава моцны у адносінах да равалюцыйнае арганізованасці. Такоя з'явішча мая вялікую пагрозу, бо даляй на захад у Беларусі маяцца мацнейшы вораг—польская буржуазія і панства з іх вядомымі лягіонамі. Польскі урад на чале с Падэрэускім знюхауся добра с хаурусными імпэрыялістамі і пастанавіу сваею першаю задачаю барацьбу с бальшавізмам. Вядома, што першаю стараною па дарозя дзеля наступу на равалюцыйную Расею з гэтаго боку будзя Беларуская Радавая Распубліка. Апроч Польшчы, вялікую шкоду пашырэньню равалюцыі на Беларусі можа зрабіць і мяйсцовая панства і буржуазія, бліская па свайму духу і ідэалогіі польскуй знаці. Усе гэтыя элемэнты, ужо ня кажучы аб тым, што варожны да сацыяльнае равалюцыі, яшчэ прагуцца да узбудаваньня Вялікае Польшчы, як гасударства, у яе колішніх рубажох. Значная частка беларускіх зямель і гарадоу, па іхнім рахункам, павінна належыць да Польшчы.

Беларускі працоуны народ і яго Радавы урад добра павінны зразумець, якая пагроза вісіць над Беларускаю Распублікаю. Дзеля ратунку інтарэсау равалюцыі, дзеля заахові вярхоуных правоу беларускаго народу на уласнасць у справах свайго палітычнаго жыцьця належыць злажыць моцную вайскавую сілу, якая б прыпыніла усякія нападкі і магчымы наступ на Беларусь. Беларускія працоунікі і селяня добра зразумелі патрэбнасць у гэтуй сіля, і ня толькі па Беларусі, але і па розных гарадох Расеі сталі складаць свыі асабліція палкі, батальёны і атрады чырвонае арміі. Такія палкі і атрады маюцца ужо у Маскве, Пецярбургу, Тамбовя, арганізуюцца у Саратавя і іншых гарадох. Шмат прыходзячых кожны дзень таварышау, жадаючых запісацца у гэтыя палкі, сьведчаць аб сваіой ахвоця паслужыць і абараніць сваю бацькаушчыну. Трэба толькі пашкадаваць аб тым, што гэтыя палкі часта ня маюць патрэбных дзеля іх рэчай, як напрыклад, варужжа, перавозачных справау, прадавольства. Але гэта ня натта вялікая бяда, бо расейскі урад, шчыра стоячы на заахова інтарэсау равалюцыі, паможа усім Беларускуй Радавуй распубліцы у арганізацыі яе вайскавое сілы.

З боку ж усіх беларускіх працоунікау і селянства патрэбна толькі пражэньня, ахвота і зразуменьня патрэбы абароны. Ідзіця ж усе у чырвоную беларускую армію, запісвайцеся у яе палкі і атрады! Памятайця, што мы, беларусы, абаронім сваею сілаю ня толькі сваю Распубліку, але і пашырыцца праз нас равалюцыя даляй на захад па усей Эуропя.

Дзеля заахові сваіх працоуных правоу, дзеля умацаваньня сацыялізму па усяму сьвету—усе беларусы у рады сваіх родных палкоу. Аб нашы жалезныя батальёны разаб'ецца злыдня контар-равалюцыі.

Неманскі.

Патрэба у працоуніках.

Усе партыйныя таварышы, прыягджаючыя з Мінску і з іншых мяйсцоу Беларусі, пакінутых немцамі, скардзяцца на тоя, што няма столькі людзей, каб зразу папхнуць уперад равалюцыйна-творчую працу. На гэтую скаргу трэба звярнуць належную увагу і зацікавіцца ею, бо яна іосьць голас тых людзей, хто дбая аб ліося равалюцыі у нашуй маладой Распубліцы і каму дарагія інтарэсы працоунаго беларускаго народу.

Прайшоушы год удырыу моцна Беларусь, мабуць мацней, чымся усе годы вайны. Ужо ня кажучы, што над Беларусю глуміліся, грабілі яе і нямецкія каменданты і польскія лягіянеры, трэба адмеціць асабліва значнасць таго пасляду, які іон пакінуу на Беларусі. Польскія паны і нямецкія юнкяры у сваім зайздросным гонары ня маглі надта лічыцца с палітычнымі правамі беларускаго працоуніка, а па сваіой варажнасці да ліва-сацыялістычных партыяу яны прагліся да скасаваньня іх. Дзеля гэтаго і камуністы і лівыя с. р. ня маглі адчыняна працаваць, ня маглі вясці навучэньня сярод народу. Мала таго, толькі найбольш сьмелыя і упартыя з партыйных таварышау засталіся на Беларусі працаваць, хоць і патаемна; слабейшыя ж, звычайныя людзі, пауцякалі аттуль, пакінуушы нясьвядомы народ самому сабе. Пастаянны уціск, паліцэйскі погляд траха ня зусім скасавау увесь послед працы сацыялістау, і Беларусь засталася даліока ззаду у справах пашырэньня сацыяльных думак.

Асабліва трэба сказаць гэта аб заходніх частках Беларусі—Гродзеншчыня і Віленшчыня, якія ва усе часы вайны і равалюцыі былі адарваны ад Расеі. Так, напрыклад, у Вільні і Гродні залажылася цьвіордая цяга да Гэ[illegible]кіі і варожны настрой да Расеі і равалюцыі. Калі ж Расейская равалюцыя увайшла у тэрмін сацыяльнае, то гэтая варажнасць яшчэ пашырылася. Яна падтрымоувалася хлусным нямецкім і мяйсцовым друкам, які плявузгау усякую брыду аб бальшавізму. Ня дзіва, што нават і бяднейшыя клясы тутэйшаго грамадзянства, будучы адарваны ад Расеі, ня асабліва цягнуліся да сацыяльнае равалюцыі. І толькі слауны рух Радавае чырвонае арміі, вызваляючы адзін за другім гарады і віоскі ад немцау і лягіянерау, далучая акупаваныя мейсца да кругу равалюцыі і знаіомць іх з мэтамі і задачамі сацыяльнае равалюцыі. Але дзеля панаваньня яе, дзеля умацаваньня сярод працоунаго народу патрэбна яшчэ вялікая прасьветная праца. Вось дзеля гэтае прасьветнае, палітычнае працы і патрэбна шмат сьвядомых камуністау.

Вялікую пярашкоду у гэтуй працы робіць вось якоя з'явішча: шмат нашых таварышау-камуністау беларусау, знайходзячыся па розным варункам у Расеі, працуюць тут. Адны з іх самі ня рупяцца ехаць да дому на працу, іншых жа ніяк ня згодны аддаць тыя установы, дзе яны працуюць. Як нашым таварышам-беларусам, так і тым установам, якія іх затрымоуваюць, мы павінны напомніць, што праца камуністау-беларусау будзя карыстаупей дома, чымся у Расеі. Трэба зразумець, што моц равалюцыі цяпер залежыць ад моцнасці равалюцыйнаго фронту на ускраінах, да якіх належыць і Беларусь. Чымся слабей будзя гэты фронт, тым большая пагроза будзя дзеля сэрца равалюцыі, ці ля быцьця самое равалюцыі. Сарганізаваныя ж і равалюцыйна настрояныя ускраіны будуць ня толькі абараняць цэнтр ад пакусау з боку контар-равалюцыі, але і паслужаць базісам дзеля пашырэньня даляй сацыялізму. Вось дзеля чаго мы прымушаны папракнуць тыя установы і тых расейскіх таварышау, якія робяць прыпынкі у справах пакіраваньня партыйных працоунікау-беларусау у родныя мейсца. Трэба згадзіцца, што партыйная праца на Беларусі у сучасны момэнт шмат патрабней, чымся у Расеі, дзе сацыяльны устрой замацавауся і ня патрабуя ужо такое пільнае зацікаулянасці.

З другого боку трэба адмеціць і няжаданую зусім з'яву. Шмат таварышау-камуністау абіваюць парогі нашых сэкцыяу па розных расейскіх гарадох, дакучаючы прозьбамі, каб іх хуччэй паслалі на Беларусь быццам дзеля партыйнае працы. Многія і надта многія з такіх асобау прагуцца працаваць толькі да тых часау, пакуль ня атрымаюць паперку аб іх пасылцы. А пасля—толькі іх і бачылі. Што ж гэта за прычына? А вось што: чулі яны, што у Мінску хунт хлеба каштуя 3 рублі, сала 25 рублёу; дык гэта ж рай, калі зраунаць з расейскімі гарадамі. Чаму ж ня паехаць туды, ды ня дастаць яшчэ вольны праезд і заработак? Дык вось што кіруя такімі людзьмі—толькі пытаньня чэрава. Вядома, што актыунае працы і дзейнасці ад такіх таварышау ня дачакаяшся, бо яны будуць перш усяго служыць свайму чэраву. Такім таварышам мы павінны сказаць, што дарога у Беларусь вольна цяпер кожнаму, але ні адна сэкцыя беларусау-камуністау, адказная за тых людзей, каго яна пасылая, як працоупіка партыі, ня будзя уважаць прозьбам і пасабляць людзям з мяртвага балота.

М. Н.

Беларусізацыя школау Беларускае Камуны.

(Пачатак у № 46).

Ужо дауно, яшчэ да равалюцыі, у чася цёмпай рэакцыі, калі усе толькі гнуліся, стагналі і еньчылі,—лепшыя працаунікі на глебя народнае прасьветы бачылі, добра праканаушыся у гэтум на практыцы, што адукацыя, пабудованая на русіфікаторскіх прынцыпах, ня можа даць жаданых рэзультатау. „Толькі адукацыю у роднуй мовя можна лічыць праудзівою адукацыяю"—сказау вялікі вучыцяль Ушынскі. Гэтыя вялікія словы на працягу блізка паувека абмярковываліся многімі пісьменьнікамі і вучоными, якія толькі застанауліваліся на пытаньні аб школя. І усе яны згаджаліся з думкаю Ушынскаго, усім было ясна і зразумелая тая шкоднасьць, якую прыносіць пераварачыванія духоунае істоты чалавека, асабліва у першуй маладой пары яго жыцця,—пераварачыванія, якоя падобна перасаджваньню маладога дрэуца з аблюбаванаго грунту у пясчаную глебу.

У нас, на Беларусі, гэта пераварачываньня зрабіла тоя, што большасьць нашых вучняу страціла праудзівы погляд на гісторыю, на самых сябе, на жыццё наогул. Вучню-беларусу прыходзілася з маленства слухаць у школя блізка ня кожны дзень аб тым, што мова яго „мужыцкая, простая, папсаваная, мяшаніна рускаго і польскаго языка." А у дварэ той-жа вучэнь гутарыу з бацькай і маткой, шчабетау з братамі і сіостамі па-свойму, на „сваіой гаворцы"; вячарамі на гэтай жа „папсавануй мовя" бабка, або дзядзіна казала яму дзіуныя казкі, будавала паветравыя гарады, замчышчы із амкі, лясы, балоты няпраходныя, страшных зьвяроу і гадау; іон сам мысьліу роднымі малюнкамі, гэтыя малюнкі былі зьвязаны з роднаго моваю, з яе чароунымі асобнасьцямі..

І вучэнь дзівіуся, чаму бацькауская мова брудная, чаму трэба говарыць па-іншаму «па-папеку», «правільна»? Псыхоліогія дваілася, трацілася праудзівыя адносіны як да школы, так глауным чынам да усяго роднаго, да бацькаушчыны.

А сколькі дарэмнай энэргіі ішло на тоя, каб навучыць беларускіх дзяцей гаварыць і троху разумець па-руску! Гэта была цяжкая праца, якая міжвольна вабакла да-русіфікацыі. Дзіціонка, які толькі пачынау пазнаваць сьвет, знаіоміцца з жыццём і навукаю, замест растлумачывання, як трэба пазнаваць навуку у першых яе прыступках, прымушалі марнаваць час на завучывання таго, што «як» —гэта «как», «столь» — «потолок», «падлога, або мост» — «пол», «конь» — «лошадь» і інш. Яму, маленькаму вучню, больш паугода прыходзілася толькі знаіоміцца з няроднай мовай. А калі іон навучауся ужо чытаць, калі яму так хацелася-бы і так было-б карысна пазнаць, вычытаць с кніжкі тое, жто іоп чуу рая ей, што яму знаіома, што іон псыхологічна разумея, у гэты час нявядомыя тэрміны, а з імі часта і іншая разуменьня. «Скворец, анст, салазки грозди, земляника, телега» і проць ма ім падобных слоу толькі перашкаджаюць у першых кроках вавучэння.

Гэтакая пярашкода цягнулася цэльных чатыры годы, у якія вучэнь быу у пачатковуй школя. Дзеля няразумення расейскай мовы прыходзілася запыняцца на кожнум уроку, гэтая пяразуменьня адбівала у некатарых зусім ахвоту да навукі, якая с першых дзіон здавалася ім ужо сухою, няпрыхільнаю. А колькі цікавасьці трацілі вурокі географіі, арыфмэцікі, прыродазнаустава з аднаго таго, што выкладаліся яны у чужой мовя! Колькі часу ішло на завучываньня расейскіх слоу!

Па глухіх куткох Беларусі іншыя вучыцялі пакідалі дзетак за кожная «нявернае» слова на 2—3 мінуты «да ціомнаго». Можна дагадацца, колькі было гэтых «пяверных слоу,» калі у некатарых школах заставалася «после вурокау» 20—25 чалавек на 1½—2 гадзіны!... Гэта драбніца, але яна надта характэрная.

І ня глядзючы на страшэнна упартую працу нашаго вучыцяльства, пакладаушаго усю сваю здольнасьць на лепшая, найхутчэйшая абрасеівання беларусау, хто з іх парэшця ня бачыу, што сапрауды праца іх была ні к чаму?

Тыя вучні, якія ня йшлі дальш пачатковай школы, праз месяц-два забывалі усю навуку аб верных словах, а іншаго школа ім нічога ня давала; такія вучні умелі толькі троху-троху ліст прачытаць, навестку, папісаць што-колечы, а аб карысьці дзеля іх навучэння, аб пашырэнні сьветагляду, аб навяліченні пазнання жыцця нечаго і думаць. Іншыя, якія ішлі дзеля далейшай адукацыі, былі усіо-ж-ткі нядавукамі. Абрусіцяльства ня магло выгнаць беларушчыны і праз 6—7 гадоу. З ранейшых двухклясовых школ у большасьці выходзілі вучні, якія ужывалі звароты мовы чыста беларускія; канчары схілення множнае лічбы у іх былі так сама беларускія.

І у канцы, што ж выходзіла посьля 7 гадоу русіфікатарской працы? Якая карысьць і каму? Ня скажу, каб былі занадта здаволены самі абрусіцялі, бо яны бачылі, што шмат працы іхняй дорма змарнована. Вучні тым больш ня маглі дзякаваць за навуку, бо аб іой у іх былі толькі адрыукі успаміпау (тут, канешня, трэба узяць пад увагу і усю руціпную падставу ранейшай адукацыі) і выхадзілі яны у жыццю духоупымі калекамі. Працоуны народ беларускі дзеля сябе ад такого навучэньня таксама ніякой карысьці ня бачыу, бо праз яго дзеці народу станавіліся як бы чужымі яму, чужымі на культуры. Значыцца, уся русіфікатарская праца толькі застанаулівала культурная разьвіцця Беларусі, толькі перашкаджала культурнай агульнасьці (общности) паміж народам і інтэлігенцыяй.

Шкоднасьць русіфікацыі вачавідна і зразумела дзеля кожнаго, хто толькі хоць троху застанауліваус на гэтум зьявішчы. Гаварыць супроць гэтаго знайдзяцца ня шмат ахвотнікоу. Значыцца, само сабою паустае пытаньня, як вылячыць гэтую хваробу, што трэба зрабіць, каб разбурыць да фундамэнту і скасаваць усе старыя прынцыпы?

Як гэта ня шкода, але і да гэтаго часу, ня глядзючы па цэльную рэвалюцыю у школьнуй справя, па пытання аб замепя у школя расейскай мовы роднао, „языком данной национальности" чамусь у Цэнтры зварочываюць мала увалі. З гэтаго вынік, што кожны народ павіняп сам клапапіцца аб сабе, ибо ніхто, апрычцяго, ня прыйдзя і ня пачне будаваць яму родная жыццё.

Гэта павінны памятаць усе беларусы; яны повінны самы узяць у свае уласныя рукі адбудову свайго культурнаго жыцця, у першы чарод школы. Радам с прынцыпами, пастаулянымі Рэвалюцыею у школьнуй справя, беларусы павінны выкінуць новы свой ліозунг — «беларусізацыя школы».

Гурык Г.

(Канец будзя).

Об издательской деятельности Белорусского Научно-культурного Общества в Москве.

В переживаемый момент огромной исторической важности, когда отдельным народностям России и других стран предоставляется широкое право самоопределения и коренного переустройства социальной и экономической жизни, белорусская народность, бывшая в течение многих веков угнетаемой и загнанной, также начинает пробуждаться [illegible]скать путей и средств к своему [illegible]но и устройству своего быта [illegible]

Новоорганизованное в Москве «Белорусское Научно-Культурное Общество», действующее в контакте с Национальным Белорусским Комиссариатом, идя на встречу требованию времени и желая всемерно содействовать стремлениям своего народа, в общем собрании своем 20 октября 1918 г. постановило для достижения означенной цели усилить свою издательскую деятельность при содействии Белорусского Национального Комиссариата и Центрального Комиссариата по Просвещению.

Издательскую свою деятельность Общество имеет в виду развивать двумя путями: во-первых, Общество ставит своей задачей издание отдельных книг и брошюр, специально научного и популярного характера, что уже и начато совместно с Культурно-Просветительным Отделом Б. Н. К. изданием недавно выпущенной в свет лекции профессора М. К. Любавского, прочитанной в первом публичном собрании Общества, и составлением имеющего в недалеком будущем выйти в свет сборника статей по белоруссоведению, составленного из лекций, читанных на курсах Белорусского Университета истекшим летом.

Для дальнейшей серии своих изданий Общество намечает целый ряд научных трудов, материалов и популярных работ, имеющих быть изданными в виде отдельных книг и брошюр. А именно:

1. Собрание материалов и исследований по этнографии Белоруссии, под редакцией хранителя отделения этнографии в Румянцевском музее Н. А. Янчука. Том рассчитан с иллюстрациями и нотами. В него войдут исключительно вновь собранные материалы из Могилевской, Гродненской, Минской, Смоленской и др. губерний по описанию быта, обычаев, по народной музыке и словесному творчеству.

2. Сборник белорусского народного поэтического творчества по источникам, опубликованным в разное время в польских, преимущественно заграничных изданиях, мало известных, а иногда и недоступных русским исследователям, притом в польской транскрипции. Представляется настоятельная необходимость извлечь, об'единить эти ценные материалы и сделать их общедоступными, опубликовав их русским шрифтом, с необходимыми об'яснениями и вступительными статьями. Эта работа заканчивается в настоящее время Н. А, Янчуком.

3. Школьный сборник белорусских народных песен, составленный Н. А. Янчуком и Б. В. Подгорецким.

4. Альбом белорусских узоров, шитья и кружев, составляемый В. Л. Турбиной и М. В. Янчук.

5. Очерки новейшей белорусской литературы: Две статьи: Илариона Святицкого и Н. А. Янчука. При отсутствии истории белорусской литературы эти очерки, выдвигающие новейших литературных деятелей Белоруссии преимущественно из народной среды, должны иметь большое значение для укрепления самосознания белорусских трудящихся масс.

6. Переходя к основной и ближайшей задаче историко-общественной науки в области краеведения, следует отметить, что в этом случае сделано весьма мало и не всегда удовлетворительно в научном отношении. Между тем, полная неизученность отдельных частей Р. С. Ф. С. Р. особенно чувствуется в настоящее время, когда в основу новой единой школы положен трудовой принцип, когда знакомству с местным краем, его историческим и экономическим особенностям отводится в единой трудовой школе видное место.

Однако, на практике очень трудно выполнять все теоретические задания, положенные в основу организации новой школы. Особенно много препятствий встретит преподаватель, работающий в школах, расположенных на территории Белоруссии, области почти неизученной, вследствие чего школьный работник почти не располагает теми научными пособиями, без которых невозможно знакомить учащихся с прошлой и настоящей жизнью области. Заполнение такого существенного пробела является очередной задачей Культурно-Просветительной деятельности Белорусского Комиссариата по Национальным Делам. В первую очередь необходимо составить школьное пособие, в котором были-бы собраны существенные отрывки из главных источников, что позволило бы широко использовать трудовой метод в деле историко-экономического ознакомления с краем. Такая историко-экономическая хрестоматия сразу позволит поставить краеведение в школе на вполне правильный путь. Школьное пособие, составленное из источников, должно заключать в себе и краткую характеристику того источника, отрывки из которого приведены в хрестоматии. В последнюю должны войти отрывки из летописи, хроник, разных историко-литературных произведений, юридических памятников, хозяйственных инвент[illegible]

(П[illegible]лжение сле[illegible])

Аб усім па троху.

З Беларусі.

Состав Временного Рабоче-Крестьянского Правительства Белорусской Советской Республики.

Временное Правительство Белорусской Советской Республики сложилось из двух групп: из состава Центрального Бюро Белорусских секций коммунистов, выделенного конференцией этих секций в Москве 21 дек. 1918 года и из ответственных деятелей и партийных работников Областного Исполнительного Комитета Западной Области.

Из первой группы в состав Правительства вошли следующие товарищи: **Д. Ф. Жилунович**—председатель Совета Народных Комиссаров Белорусской Республики, **В. С. Фальский**—Комиссар по иностранным делам, **О. Л. Дыло**—Комиссар Труда, **Д. С. Чернушевич**—Комиссар Социального Обеспечения, **А. И. Кваченюк**—юстиции, **А. Г. Червяков**—Народного Просвещения и **И. И. Пузырев**—Здравохранения.

Из второй группы в состав Правительства вошли следующие товарищи: **Иванов**—комиссаром по внутренним делам, **Мясников**—военным, **Савицкий**—путей сообщения, **Кальманович**—продовольствия, **Рейнгольд**—финансов, **Ф. Г. Шантыр**—национальных дел, **Пикель**—председателем Совнархоза, **Андреев**—комиссаром земледелия, **Розенталь**—почт и телеграфов и **Бергсон**—государственного контроля.

Пратэст Міністрау Беларускае Рады.

Рада Міністрау Беларускае Народнае Распублікі, уцiокшая з Мінску і асядзеушаяся у Гродні, паслала Польскаму Ураду і прадстаунікам Антанты ноты пратэсту процiу аннэксіоністкіх дамаганняу Польшчы. Выбары да Польскаго Устаноучаго Сойму абвешчаны у Беластоцкум і Бельскум паветах з беларускім насяленьням. Аугустоускі павет Сувалкскае губ. палкам далучаны у склад Польшчы, а у Вільні 31 дзякабра палякі абвясьцілі мобілізацыю. Рада Беларускіх Міністрау, ня маючы збройнае сілы дзеля абароны ад ворага, просіць Антанту ня дапусьціць расцярзання Беларусі яе суседзямі.

Пропаганда „нязалежнасьці".

Эмісары Беларускае Рады у Гродзянск. губ. вядуць пропаганду нязалежнасьці і гуртуюць народную міліцыю. Літоуская Тарыба працуя боляй энэргічна і у боляй ярым рэакцыйнум кірунку.

Беларуская гімназія у Вільні.

У хуткум чася у Вільні адчыняяцца 1-ая Беларуская гімназія з навучанням па-беларуску і па-расейску. Гімназія будзя карыстацца звычайнымі правамі урадавых школау. Апрача агульных навукау будуць выкладацца: гісторыя Беларусі і Літвы, беларуская літэратура, беларуская мова, краязнаўства і інш.

Да гімназіі прымаюцца асобы абодвых станау бяз розніцы нацыянальнасьці. Прозьбы можна падаваць штодзенна ад 11 да 2 гадз. у кніжніцы „Знание" на Віленскуй вул., 33.

Вучэння будзя адбывацца у будынку праваслаунае духоунае сэмінарыі (Астрабрамская, 9) і пачнецца ня пазьней 20-го января гэтаго году. («Нов. Эра»).

У Расеі.

Делегація от Беларусскаго Советскаго Правительства в Москве.

16 января в Москву прибыла из Минска делегация от Временного Рабоче-Крестьянского Правительства Белорусской Советской Республики в составе Жилуновича, Петенкого, Фальского и Шантыра. Целью делегации было выяснение многих организационных вопросов и, в частности взаимоотношений между обеими республиками. Делегация посетила многих из видных деятелей Российского Советского Правительства и имела продолжительные совещания с председателем В. Ц. И. К. тов. Свердловым, тов. Иоффе и другими. Последний получил поручение сказать содействие Советскому Белорусскому Правительству в разрешении вопросов внутренней организации и конструирования власти. Делегация отбыла в Минск вечером [illegible]

К открытию Университета в Минске.

После продолжительных переговоров с Центральным Комиссариатом Просвещения об открытии Университета на территории Белоруссии, наконец 20 января получено принципиальное согласие Комиссариата открыть Университет в Минске с отпуском необходимых средств. Заместитель Комиссара Народного Просвещения проф. Покровский поручил уроженцу Белоруссии проф. Брайцеву, состоящему ныне деканом математического факультета Нижегородского Государственного Университета разработать и провести в жизнь планы и организацию Белорусского Университета. Минский Университет предполагается открыть в составе следующих факультетов: математического, естественного, агрономического, медицинского, художественно-литературного и социально-исторического. Об открытии Университета послано извещение в Минск Временному Рабоче-Крестьянскому Правительству Белорусской Советской Республики с просьбой дать свое согласие к открытию Университета в Минске.

В Белорусском Вольно-Экономическом Обществе.

Из Петрограда нам сообщают, что к 1-му февраля 1919 года в Минск выезжает председатель Белорусского Вольно-Экономического Общества Е. С. Канчер. Целью этой поездки является осведомление о возможности деятельности Общества на территории Белоруской Республики и представление смет по мероприятиям, проэктируемым к проведению в жизнь Белорусским Вольно-Экономическим Обществом.

Пратэст Расейскаго Ураду.

Камісар чужаземных спрау Расейскае Радавае Распублікі тов. Чычэрын зьвярнууся па радзіо-тэлеграфу да Нямецкаго Ураду, Бэрлінскаго Спауняючаго Камітэту і усіх Радау Нямеччыны, а так сама да усіх урадау Дзяржау Згоды с пратэстам процiу таго, што хаурусьнікі бяруць па сябе дагляд над расейскімі ваенна-палоннымі у Нямеччыня і над парадкам іх адпраукі на бацькаушчыну. Тов. Чычэрын абвяшчая, што гэта іосьць нячуваным бязчынствам і парушэнням праву Расейскае Распублікі, Расея нікога ня прасіла і ня просіць клапаціцца аб яе ваенна-палонных. Яна сама можа аб іх паклапаціцца.

Праудзівыя намерання Антанты, заставіушыя яе узяць на сябе дагляд за расейскімі ваенна-палоннымі хаваюцца у яе баязьні большэвіцкай пропаганды у Нямеччыня і у яе няхаценні дапусьціць туды якіх-бы то ні было прадстаунікау Радавае Расеі.

Сьледзтва над Тарыбаускімі міністрамі.

Законьчылася сьледзтва над Тарыбаускімі міністрамі, застаушыміся у Вільні: Выгодскім, Янушайцісам, Бержышко і Сташынскім. Выясьнілася, што яны зусім адыйшліся ад Тарыбы і яе палітыкі. Выгодскі і Бержышко асвабоджаны, Янушайціс адданы на парукі, сьледзтва аб Сташынскум завяршыцца гэтымі днямі.

Урад Літоускай Радавай Распублікі.

У склад ураду Літоускай Радавай Распублікі вайшлі: Міцкевіч—прэзыдэнт і народны камісар чужаземных спрау, Антонау—унутраных спрау, Цэхоускі—фінансау і зямляробства, Дыманштэйн—працы, Яскевіч—коммунікацыі, Пролетарас—почты і талеграфу, Вайнштэйн—народнае гаспадаркі, гандлю і прамысловасьці.

Памяці Лібкнэхта і Розы Люксэмбург.

19 января у Маскве адбыліся вялікія дэмонстрацыі і мітынгі, учыняныя маскоускімі работнікамі у чэсьць загубляных правадыроу нямецкаго работніцкаго клясу: Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург. У знак жалобы зачыняны усе тэатры і кінэматографы.

Зліот чорнасоцянцау.

У Новачаркаску мая сабрацца зьезд сяброу усіх 4-х Дзяржауных Дум. Зьезд будзя разглядаць пытання аб будучыня Расеі, Дону і Украйны.

Украінская дэлягацыя у Маскве.

У Маскву прыехала дэлягацыя Украінскае Дырэкторыі дзеля згавору аб вастанову нармальных зносін паміж Украйнай і Расейскай Радавай Распублікай.

Пошусьць у Маскве.

За тыдзень с 11-го [illegible] 18-я января у Маскве захв[illegible] [illegible]мі хваробамі 1.723 [illegible] 1.165—на сыпны [illegible]

тыфус. Дзеля гэткае вялікае лічбы захварэушых праводзіцца мобілізацыя усіх мэдыцынскіх сіл, устаноул на працоупая павіннасьць студэнтау-мэдыкау.

У Адэсе.

Адэса занята хаурусьнымі і кубанскімі вайскамі. Пятлюраусцы пры сваіом адходзя вывязьлі усе вагоны і цягнікі. Адэса адрэзана ад усяе Расеі. Наустала нябывалая раней дарагаўля. Фунт масла у вольнуй прадажы каштуя сорак рублёу, фунт мяса—восім рублёу, хлеба па картках выдаюць чвэрць фунта на дзень. Камандавання хаурусных войск усякімі спосабамі змагаяцца з большэвізмам, але іх гвалты маюць адваротны скутак, і большэвізм пашыраяцца сярод работніцкіх мас.

Ідалапаклонства у Расеі.

У Сэрдобскі Камітэт Расейскае Камуністычнае Партыі прывезены з сяла Апраксіна два ідалы, якім кланяліся апраксінцы: бог дажджу і бог грому. Ідалы будуць адасланы у Маскву.

Нота Расейскаго Ураду да Дзяржау Згоды.

Комісар Чужаземных спрау Расейскай Радавай Распублікі зьвярнууся да урадау Францыі, Вялікабрытаніі, Амэрыкі, Італіі і Японіі з нотаю, у якой іон указывая на рэзолюцыю французкай конфэдэрацыі працы аб няумяшательстве у расейскія справы і заяуляя, што Расейскаму Ураду дагэтуль нявядома, што робіцца дзеля выпаунення гэтаго пажадання французскіх работнікау.

К гадавінам Чырвонае Арміі.

28 января як раз скончыцца перш год істнения Чырвонае Арміі Расейскае Сацыалістычнае Распублікі. Ка дню гадавін будзя выданы спэцыяльны зборнік з аглядам гісторыі Чырвонае Арміі.

Раунапраунасьць мовау.

Часовы Равалюцыйны Работніцка-Сялянскі Урад Літвы запрапанавау мяйсцовым установам адказваць на падаваемыя паперы у той мовя, у якой яны напісаны. Афіцыальна абвяшчаяцца раунапраунасьць мовау усіх народау Літвы (расейцау, літоуцау, беларусау, жыдоу і палякоу).

За рубяжом.

Забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург.

На мінулум тыдні нямецкі пралятарыят паніос цяжкую страту: загінулі яго лепшыя правадыры, найшчырэйшыя і найгарачэйшыя абаронцы—Карл Лібкнэхт і Роза Люксэмбург, доугі час стаяушыя на самум левум скрыдля нямецкае соцыал-дэмакратыі. Згодлівіцкая палітыка Шэйдэмана-Эбэрта прывяла бэрлінскіх работнікау да збройнаго паустання процiу цяперашняго нямецкаго ураду. Посьля таго, як паустання было зьліквідована, К. Лібкнэхт і Р. Люксэмбург былі арыштованы. Аутамабіль, на якім адвозілі Лібкнэхта у турму, па дарозя сапсавауся. Лібкнэхта вывялі з аутамабілю і павялі пешкі. Афіцыальная павядамлення гаворыць, што Лібкнэхт пробавау уцячы і вартавыя застрэлілі яго трыма кулямі, папаушымі у сьпіну. Аднак, газэта незалежных с.-д. „Фрайхайт" піша, што Лібкнэхт забіты куляю, папаушаю у грудзі. Урад назначыу сьледзтва, але толькі с назначаных ім чыноуцікау. Незалежныя трэбуюць дапушчэння у сьледчую камісію іх прадстаунікоу.

Роза Люксэмбург была арыштована аднача́сьня з Лібкнэхтам. Аутамабіль, на якім яе вязьлі, быу запыняны натоупам з адным з Бэрлінскіх мастоу натоупам народу. Розу Люксэмбург схапілі з аутамабілю і, гдзе яна падзелася, нявядома. Думаюць, што азьвярэушы натоуп кінуу яе у раку.

Мірная конфэрэнцыя.

18-га января у Парыжу адбылося урачыстае адчыненя мірнае конфэрэнцыі. Прывітальную прамову сказау Прэзыдэнт Французкае Распублікі Пуанкарэ. Посьля яго гаварыу Вільсон, які запрапанавау выбраць прэзыдэнтам конфэрэнцыі прэзыдэнта французкае Рады Міністрау—Клемансо. Клемансо быу выбраны аднагодна.

Апэтыт Японіі.

Японія намервацца патрабаваць сабе на мірнум конгрэсе [illegible] і Каралінскіх выспау і асобнага праву на Сыбір.

Шукаюць дэлегатау ад Расеі.

Ангельскі урад зьвярнууся у Парыж, Рым, Вашынгтон і Токіо с прапазіцыяй прызнаць урады Колчака, Дэнікіна і Чайкоускаго с тым, каб гэтыя урады аб'еднаніся і прыслалі на мірную конфэрэнцую агульную дэлягацыю ад імяні Расеі. Амэрыканскі статс-сэкрэтар чужаземных спрау Лансінг абвясьціу, што амэрыканскі урад ня згаджаяцца з гэтаю прапазіцыяй.

Праграмма сін-фэйнэрау.

Сін-фэйнэры (ірляндзкая равалюцыйная партыя) апрацавалі праэкт конституцыі Ірляндыі. Подлуг гэтаго праэкту Ірляндыя павінна быць нязалежнай распублікай, зусім асобнай ад Англіі, і іншых дзяржау. На чале Ірляндзкае Распублікі павінна стаяць урад у складзя 1 прэзыдэнта, 2 яго намесьнікау, 2 сэкрэтароу, 2 скарбнікау і 4 народных упоунаважаных.

Польскія дамагання растуць.

Чэха-славацкая бюро друку парадае, што польскія газэты трэбуюць, каб нова паустаюай польскуй дзяржавя была дана колiонія у Афрыцы, велічынiою ня меньш, як у 100 000 квадратн. кіломэтрау. Польскія газэты хочуць, каб Польшы была аддана часьць Нямецкае Усходняе Афрыкі, Камэрун с прыбярэжнаю паласою і хоць адна гавань.

Украінская Рада у Парыжу.

У Парыжу залажылася Украінская Нацыанальная Рада, якая ставіць сваім заданням інфармавання Антанты аб украінскіх справах. Яна зьвярнулася да французкаго ураду с прозьбой прызнаць Дырэкторыю.

Нацыанальная Рада хадайнічая аб прызнанні украінскаго ураду у спэцыяльнуй даклярацы аб падмозя яму у справя барацьбы з бальшэвікамі, аб адкладзя масавае высылкі расейскіх і украінскіх палонных з Нямеччыны і Аустра-Вэнгрыі і нябаунум адасланні на Украйну украінскаго легіону, які знаіходзіцца цяпер на рабоця у Францыі.

Люксэмбургская распубліка.

Вялікая гэрцогіня Люксэмбургская адраклася ад прастолу. У Люксэмбургу агалошана распубліка.

Тарыба і хаурусьнікі.

Газэта „Коммунист" піша, што хаурусьнікі адчынілі Тарыбя вялікі крэдыт

Нямецкія дэлягаты на мірную конфэрэнцыю.

Нямецкі Урад разглядау пытання аб складзя дэлегацыі на мірную конфэрэнцыю. Пастаноуляна, што кіраунікамі яе будуць Ранцау і Шэйдэман. Нямецкі Урад гатоу выпауніць праграмму Вільсона, але будзя працівіцца усім дамаганням хаурусьнікау, выходзячым за яе рубяжы.

Выбары да Польскаго Сэйму.

Выбары да Польскаго сэйму назначаны на 16 феураля. Выбары адбудуцца на усіой тэрыторыі бышае расейскае Польшчы і Заходняе Галіцыі. Ад Пазнані і Усходняе Галіцыі у склад сэйму увойдуць бышыя дэпутаты Бэрлінскаго Рэйхстагу і Венскаго Рэйхсрату.

Жыдоускія пагромы у Польшчы.

Варшауская газэта „Гайнт" піша, што ва Улацлауску адбыуся жыдоускі пагром. Польская паліцыя ня чыніла жадных перашкодау пагромшчыкам. Іосьць забітыя і зраняныя.

Сыоністы і Англія.

Газэты павядамляюць, што сыоністы мелі параду з ангельскім міністрам чужаземных спрау. Міністр запэуніу аутаномію яшчэ шырэйшую, чым раней праэктавалася. Сыоністы спадзяюцца мець яшчэ параду з Вільсонам.

Редактор и Издатель:
Редакционная Коллегия.

Тов. белоруссы—коммунисты и им сочуствующие!

Желающие поступить и перевестись из Советских учреждений в **9-й Белорусский Полоцкий Полк** обращайтесь за справками в Спасские казармы, первый флигель, 3 этаж, ком. № 9, и Пречистенский бульвар 29, кв. 24.

ПАВЯДАМЛЕНЬНЯ.

Радакцыя газэты „Дзянніца" с 10 января 1919 году пераведзяна на Прачысцянскі бульвар, дом № 29, квартэра 24, куды і належыць прысылаць усякую караспандэнцыю датычна радакцыі.

Радакцыя.

[illegible] пер., д. 12.